Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2012-10-05

# Пад вокладкай




**Блінец, А. У. Клецк. Старонкі даўняй гісторыі / Андрэй Блінец. — Мінск: Рэдакцыя газеты "Звязда", 2012. — 112 с.**

Андрэя Блінца, маладога аўтара з Клецка, таленавітага гісторыка, жаданага госця на старонках "ЛіМа", можна павіншаваць з удалым кніжным дэбютам. У гэтым даследаванні яго праца па вывучэнні гісторыі роднага горада стала цэласнай. А значыць, больш каштоўнай як для аўтара, так і для чытачоў. Аўтар закранае асноўныя падзеі з жыцця Клецка пачынаючы з яго ўзнікнення і ранняй гісторыі горада, асаблівасцей знаходжання зямель Клеччыны ў складзе ВКЛ і заканчваючы падзеямі, што адбыліся тут перад Першай сусветнай вайной.




**Слоўнік лексікаграфічных варыянтаў у мове твораў Якуба Коласа / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. А. М. Астапчук. — Мінск: Беларуская навука, 2012. — 653 с.**

Гэты слоўнік прысвечаны лексікаграфічнаму апісанню моўнага багацця твораў Якуба Коласа. З дапамогай коласаўскага кантэксту ў ім раскрываецца сэнсавае значэнне слоў, выкарыстаных пісьменнікам у мастацкіх і публіцыстычных творах, дзённіках і лістах. Рэестр слоўніка, які налічвае каля 7 тысяч артыкулаў (загалоўнымі з'яўляюцца каля 2500 лексем), максімальна поўна прадстаўляе лексічныя варыянты твораў класіка. Лексічная варыянтнасць у выніку паказвае: працэс выпрацоўкі літаратурных норм праходзіў праз творчасць Я. Коласа ў некалькіх кірунках: засваенне лексічнага багацця народнай мовы, выбар найбольш актыўных, тыповых для беларускай мовы элементаў, устанаўленне сістэм слова.



**Неизвестные страницы истории Белой Руси в документах и исследованиях (с древнейших времён до 1569 года) / сост. Н. Н. Малишевский. — Минск: Ильин В. П., 2012. — 736 с.**

Гэта кніга не толькі ўключае цікавыя, амаль невядомыя матэрыялы, але і з'яўляецца своеасаблівым даведнікам па крыніцах старажытнай беларускай гісторыі, ахопліваючы перыяд да заключэння Люблінскай уніі. Кніга створана на аснове фундаментальных работ айчынных гісторыкаў і навукоўцаў. Гэтыя работы дзясяткі год праляжалі ў савецкіх спецыяльных сховішчах. Значна і тое, што тэкст суправаджаецца адпаведнымі па храналогіі дакументамі і матэрыяламі, многія з якіх не перавыдаваліся стагоддзямі.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

***Водгукі дасылайце на электронны адрас аўтара: himarina@tut.by***

**Кнігі для агляду прадастаўлены магазінам "Кніжны салон". Тэл.: 385-60-89.**